**А. І. Бельскі (Мінск)**

# МАТЫЎ ЦІШЫНІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ: ПРЫРОДНАЕ, САЦЫЯЛЬНАЕ, ДУХОЎНАЕ

Сярод успрымальных элементаў прыроды матыў цішыні ў беларускай паэзіі з'яўляецца сэнсаўтваральным, пра што сведчаць матэрыялы складзенага намі частотна-тэматычнага слоўніка асноўных пейзажных тэм [Бельскі 1998, с. 200]. Зусім заканамерна ўзнікае пытанне пра семантычную напоўненасць гэтага вобраза-матыву, і таму важна высветліць, што ён утрымлівае найбольш характэрнае, устойлівае, нацыянальна адметнае.

Беларускія паэты імкнуліся «*на схіле веку... слухаць цішыню*» (А. Канапелька). І гэта можна вытлумачыць тым, што ціхім XX ст. назваць цяжка, немагчыма; наадварот, яно было гулкае, навальнічнае, грымотнае. У паэзіі хапала барабаннага грукату, звону, бадзёрых рытмаў, нездарма пасля параднай святочнасці, одаў і гімнаў яна, пачынаючы з другой паловы 50-х гг., пацішэла, рабілася одумнай, разважлівай, засяроджанай. Можна згадаць лірыку М. Рубцова пра «*тихую родину*» ці верш паэта Ю. Свіркі «Ціхая паэзія». Сапраўды, «*думкі ткуцца ў цішы*», і таму лірыка — гэта перадусім ціхая і даверлівая споведзь.

Цішыня ўспрымаецца паэтамі як адкрыццё, момант абсалютнай гармоніі, прыроднай ідыліі. Цішыня ў прыродзе — працэс сімбіёзу, нараджэння прыгажосці і жыцця, і гэтае непрыкметнае, адухоўленае абнаўленне свету праніклівa выяўляе Р. Барадулін у вершы «Зялёная цішыня»: «*Зеляніну на нячутных кроснах // Тчэ абновай дню штодня зямля*». З экспрэсіўнасцю малюе ён вобраз цішыні: «*Цішу хоць разлівай у кубкі, сырадойную, ціхмяную*». Цішыня — гэта не толькі маўчанне, знямеласць прыроды, адсутнасць шуму і гукаў. Цішыня ў адлюстраванні паэтаў — гэта дзівоснае багацце момантаў, імгненняў, адценняў, яна адносная, не абсалютная, мае свае гукавыя праявы. У вершы А. Вярцінскага «Тры цішыні» прырода паўстае ў трох іпастасях: вячэрняй, начной і ранішняй. Тры цішыні бачацца паэту як узаемаспалучаныя станы прыроды, вышэйшая гарманічная цэласнасць. Цішыня на зыходзе дня вабіць магічным характвом, ноччу яна — момант самапазнання, раніцай — гэта абуджэнне, радасць «першага вітання»: «*Трубіць ціша світальная, // крышталъная, развітальная, // і патанае яна // у вадаспадзе дня*». Шматаблічныя малюнкі цішыні ў паэзіі Т. Бондар. Паэтка вельмі часта пераключала ўвагу на любімы ёю стан навакольнага свету, які найбольш дабратворна ўплываў на яе душэўнае самаадчуванне. Яна стварыла шматлікія метафарычныя вобразы цішыні: «*ціша дрэмле столкамі парчы на бярозе*», «*вылушчыць з а-ню сонечную цішыню*», «*пахне цёплым хлебам цішыня*» і інш. Вобраз цішыні ў паэтычным уяўленні Т. Бондар выступае як сімвал мірнага, шчаслівага бытавання на зямлі: «*У свеце — неабходная для шчасця, // Пявучая зямная цішыня*».

Ціхаму ідылічнаму пейзажу ў паэзіі часта супрацьпастаўляецца бурны, стыхійны. Прырода тоіць у сабе магутныя сілы, але яна *«беспристрастна к человеку»* (М. Чарнышэўскі). Прырода Зямлі сама церпіць і перайначваецца, калі здараюцца катаклізмы і катастрофы. Стыхійныя сілы — смерч, цунамі, землятрус — сляпыя і бязлітасныя. Менавіта так іх малюе Р. Тармола-Мірскі: *«Дзень новы. Цішыня. Пагода. // І раптам ашалелы смерч. // Як нейкі вылюдак прыроды, // Нясе самой прыродзе смерць»*. Цішыня пасля катаклізмаў спустошаная, безжыццёвая, дыхае смерцю. Чалавек зрабіўся разбуральнікам цішыні-гармоніі, бо войны, выпрабаванне ядзернай зброі, меліярацыя, вынішчэнне лясоў, парніковы эфект пагражаюць глабальнымі экалагічнымі наступствамі. У эпіграф да апісання навальніцы (паэма «Колькі лет, колькі зім!») А. Вярцінскі выносіць словы з навуковай працы: *«Чалавечы розум не спыніць атак да таго часу, пакуль не падначаліць сабе ўвесь свет прыроды»*. Паэт дае слова самой Прыродзе, увасабляючы яе ў вобразе стыхіі. Абуральны і суровы тон гэтага маналогу перадаецца праз адпаведны рытміка-гукавы лад верша: *«Зіг-заг — па вашых пагрозах! // Трах-тарах — па вашых прагнозах! // Па вашых амбіцыях і апетытах. // Мала, падобна, мною бітых!»* Прырода карае чалавека, плаціць тым, што ён заслужыў. Аднак Р. Барадуліна палохае *«цішыня, што чалавечым голасам заплача»*. *«Цішыня гняце пакутна»* многіх паэтаў, якія рэагуюць на праблемы экалогіі. Безжыццёвая цішыня стала рэальнасцю ў чарнобыльскай зоне. Паэта М. Мятліцкага ў родным Бабчыне балюча кранае *«ціша зямлі»* і апусцелая *«ціхая вёска»*. Смяротная цішыня можа стаць рэальнасцю для ўсёй планеты, таму *«У мірнае зямлі на далані // Балюча важыць зерне цішыні»* (Р. Барадулін). Жывучы трывогамі часу і веку, калі на зямлі *«цішыня... навастрыла меч»*, беларуская паэзія даўно хвалюецца пра тое, як захаваць мір, спакой, суладдзе. Мір-цішыню як самае запаветнае і доўгачаканае сустракаў беларус пасля суровых выпрабаванняў, пра што гаворыць у адным з вершаў П. Макаль: *«Мы ў цішыню // Вярнуліся, як дадому. // З крыку. // З агню. // З грому»*. Меў рацыю У. Салаухін, калі сказаў: *«Цішыня — вось самы вялікі дэфіцыт на зямным шары»* [Солоухин 1983, с. 432]. *«Падарыце, людзі, цішыню... // сцежцы і сасне, гнязду і дому...»*, — гучыць па-жаноцку кранальная просьба Е. Лось.

Спакою, цішы як адхлання, псіхаэмацыянальнага адпачынку бракуе сучаснаму чалавеку, які ўцягнуты ў імклівы кругазварот часу і на якога негатыўна ўздзейнічае урбанізаваны асяродак, бо сёння мы прызвычаіліся да *«шуму, да тлуму, да глуму»* (К. Цвірка). Чалавека наэлектрызоўвае штодзённая мітусня, разбалансоўвае *«гонка амбіцыёзнага глупства»* (П. Макаль). А таму як вынік — *«Стрэсы нас даганяюць, інсульт. // Хцівасць нас даганяе драпежная»* (Я. Янішчыц). Патрэбу вырвацца з ненатуральнага існавання ў свет прыроды патлумачыў Д. Ліхачоў: «Чалавеку ў наш час як ніколі важна перыядычна, не ад выпадку да выпадку, пераключацца на цішыню, на прыроду і на высокія развагі. Гэта не добрае пажаданне, а аб'ектыўная неабходнасць, умова, пры якой мы можам ствараць маральна здаровае, актыўнае,

псіхалагічна ўстойлівае грамадства…» [Лихачев 1996, с. 253]. Цішыня ва ўспрыманні паэтаў — гэта прыродны стан, ідэальны для чалавека, яго існавання. Таму герой паэзіі П. Макаля прагне ўцёкаў з сучаснай урбанізаванай цывілізацыі: «*Ад духаты кватэр, // Ад чаду вуліц тлумных // Лячы сябе цяпер // Жывіцай сосен думных, // Пяшчотай дрогкіх траў, // Бязмежнасцю прасторы…*». Цішыня прыроднага ўлоння стварае гарманічнае суладдзе чалавека і прыроды, яна здымае цяжар гнятлівых пачуццяў, прыносіць супакаенне, радуе, прасвятляе, лечыць, аднаўляючы ўнутраныя і фізічныя сілы. М. Арочка мяркуе: «*Да бароў, да яроў крутабокіх // Кліча нас першародны спакой. // Можа, гэта зусім не ўцёкі, // А патрэба натуры людской*». «*Я лясную люблю цішыню*», — прызнаецца Ю. Свірка. Спакой, цішыня ў прыродзе бачыцца яму як шчыры, бязмежны давер прыроды да чалавека. Цішыня-гармонія, цішыня-паэзія выклікаюць у душы паэта пачуццё эстэтычнай асалоды і захаплення: «*Такая цішыня ў прыродзе! // Спяць людзі, краскі і чмялі…*». «Я» паэта Г. Бураўкіна таксама зліваецца з прыродай і нібы растварaецца ў цішы краявідаў: «*З небам там перапляліся // Цёплы дзень і цішыня, // Я і сам быў сярод лісця, // Як малое птушаня!*». Цішыня ў прыродзе як свет першародны, прыгожы, загадкавы паўстае з вершаў У. Лісіцына. Яго пейзажныя замалёўкі — мяккі, ціхі, настраёвы жывапіс словам: «*Ціхая мова, ціхая рэчка…*»; «*…Зялёная папарадь збоку, як жабры, — // І дыхае лёгка таму беразняк*». «*Якая музыка — цішыня!*» — усклікае Я. Сіпакоў. У бязгучнасці, здавалася б, свету ён улоўлівае самыя мікраскапічныя зрухі. Яму хочацца, каб чалавек адчуў гэтую дзівосна-ціхую, чароўную музыку прыроды: «*Толькі сена пах і паветра пах, // Толькі сонца пах і блакіту пах…*». Пахі ўзмацняюць эстэтычнае перажыванне прыгажосці.

Прыглушанасць, сцішанасць краявідаў — тыповае аблічча нацыянальнага пейзажу, што паўплывала на мяккасць, стрыманасць характару беларуса. Вобраз цішыні як увасабленне роднага краю паўстае з вершаў А. Грачанікава, які паэтызаваў верасnёвую цішу, сваё ціхае Палессе, часта звяртаўся да фарбаў акварэльных, лагодных, пяшчотных. Яму ўласціва адчуванне чагосьці спрадвечнага, стоенай глыбіні ў ціхіх краявідах радзімы. Цішыня блізкая і жаданая для паэта, яна патрэбная, каб узнесціся душой і духам над будзённасцю існавання: «*У верасnёвай выспелай цішы // і сонечна, і лёгка на душы*». Цішыня даносіць да чуйнага слыху паэта: «*Як вечнасць, асядаючы на дол, // Бiцца зямнога запаўняе соты*». Так, цішыня спявае пра вечнасць. Гэта адчувае герой А. Грачанікава. У сцішанасці свету глыбей адчуваецца каштоўнасць роднага, зямнога, вечнага, і, зрэшты, самой вечнасці, якая не ўяўляецца паэту без духоўнай еднасці чалавека і прыроды.

Як пераконвае разгледжаны тэкставы матэрыял, праз матыў цішыні раскрываецца не толькі ўласна прыроднае, але і сацыяльнае, духоўна значнае. Цішыня-гармонія паўстае з вершаў беларускіх паэтаў як сімвал жыццятворнага пачатку на зямлі, паўнавартаснага чалавечага існавання.